УДК 94(476.4):902:308(1-22)"17"

# Да пытання аб часе заснавання Краснаполля

**Мяцельскі А.А.**
*Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Мінск*

*Пытанні ўзнікнення і першапачатковых крокаў таго ці іншага населенага пункта з'яўляюцца адной з найцікавейшых задач гістарычнай навукі. Часам здараецца, што аднойчы прапанаваная кімсьці дата першага згадвання ў пісьмовай крыніцы населенага пункта замацоўваецца, хаця пры бліжэйшым навуковым разборы дакумента аказваецца, што ён не мае ніякага дачынення да нас паселішча, якое нас цікавіць.*

*Мэта артыкула – высвятленне часу ўзнікнення сучаснага гарадскога пасёлка Краснаполля Магілёўскай вобласці.*

***Матэрыял і метады.** Для напісання артыкула выкарыстаны матэрыялы, выяўленыя ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, Дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай Рэспублікі, Нацыянальнм архіве Польшчы ў Кракаве, Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў. Пры распрацоўцы пытання выкарыстоўваліся як агульнагістарычныя і археалагічныя метады, так і спецыяльна-гістарычныя: гістарычнай рэканструкцыі, картаграфічны.*

***Вынікі і іх абмеркаванне.** На падставе аналіза як археалагічных, так і пісьмовых крыніц, атрыманых у розных архівах высветлена, што паселішча на месцы г.п. Краснаполле існавала ў XI–XIII стст., аднак бесперапынна да сённяшняга дня паселішча пад назвай Краснаполле існуе на сучасным месцы з пачатку XVIII ст. і, верагодна, было заснавана ў выніку сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна.*

***Заключэнне.** Вёска Краснаполле ўзнікла ў 10–20-х гадах XVIII ст. у выніку сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна, якое актывізавалася пасля заключэння ў 1686 г. "Вечнага міру" Рэчы Паспалітай з Расіяй. Менавіта ён даў штуршок для асваення памежжа як з рускага боку, так і з боку Рэчы Паспалітай.*

***Ключавыя словы:** курганны могільнік, вёска, мястэчка, Рэч Паспалітая, Прапойскае старостваа, XVIII ст.*

*(Ученые записки. – 2021. – Том 34. – С. 65–69)*

# To the Issue of the Time of the Foundation of Krasnopolye

**Miatsełski A.A.**
*Institute of History of the National Academy of Sciences of Belarus, Minsk*

*The issues of the origin and initial steps of a particular settlement are one of the most interesting tasks of historical science. Sometimes it happens that once someone suggested the date of the first mention of a settlement in a written source is fixed, although with the closest scientific analysis of the document it turns out that it has nothing to do with the settlement we are interested in.*

*The purpose of the article is to find out the time of the emergence of the modern urban settlement of Krasnopolye, Mogilev Region.*

***Materials and methods**. The materials found in the National Historical Archive of Belarus, the State Historical Archive of the Republic of Lithuania, the National Archive of Poland in Krakow, the Russian State Archive of Ancient Acts were used. When developing the issue, both general historical and archaeological methods and special historical methods were used: historical reconstruction, cartographic.*

***Findings and their discussion.** Based on the analysis of both archaeological and written sources obtained in various archives, it has been established that the settlement on the site of Krasnopolye existed in the XI-XIII centuries, however, continuously until today, a settlement called Krasnopolye has existed on the present site since the beginning of the XVIII century and was probably founded as a result of the social and economic development of the region.*

***Conclusions.** The village of Krasnopolye arose in the 10–20-ies of the XVIII century as a result of the social and economic development of the region, which intensified after the conclusion of the "Eternal Peace" of the Polish-Lithuanian Commonwealth with Russia in 1686. It was it which gave an impetus to the development of the borderland both from the Russian side and from the Polish-Lithuanian Commonwealth.*

***Key words:** burial mound, village, town, Polish-Lithuanian Commonwealth, Propoisk region, XVIII century.*

*(Scientific notes. – 2021. – Vol. 34. – P. 65–69)*

*Адрас для карэспандэнцыі:* ***e-mail: andreika.miacelski60@mail.ru*** *– А.А. Мяцельскі*

Пытанні ўзнікнення і першапачатковых крокаў таго ці іншага населенага пункта з'яўляюцца адной з найцікавейшых задач гістарычнай навукі, бо менавіта з асобных фрагментаў складваецца агульны арнамент таго ці іншага малюнка, у тым ліку і гісторыі краю. Часам здараецца, што аднойчы прапанаваная кімсьці дата першага згадвання ў пісьмовай крыніцы населенага пункта замацоўваецца, хаця пры бліжэйшым навуковым разборы дакумента аказваецца, што ён не мае ніякага дачынення да паселішча, якое нас цікавіць. Такая сітуацыя склалася сёння і ў адносінах да даты першага згадвання Краснаполля, цэнтра Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці.

Мэта артыкула – высвятленне часу ўзнікнення сучаснага гарадскога пасёлка Краснаполля Магілёўскай вобласці.

**Матэрыял і метады.** Для напісання артыкула выкарыстаны матэрыялы, выяўленыя ў Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі, Дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай Рэспублікі, Нацыянальнм архіве Польшчы ў Кракаве, Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў. Пры распрацоўцы пытання выкарыстоўваліся як агульнагістарычныя метады, так і спецыяльна-гістарычныя: гістарычнай рэканструкцыі, картаграфічны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У гісторыі пытання ўзнікнення Краснаполля на сённяшні дзень склалася даволі парадаксальная сітуацыя, калі гэтае пытанне цікавіць у асноўным мясцовых краязнаўцаў, а вось гісторыкі не ўдзяляюць пэўнай увагі дадзенаму пытанню. Таму сёння існуе шмат варыянтаў аднаго і таго ж падання, якое зводзіцца да таго, што Краснаполле ўзнікла недзе падчас руска-шведскай вайны (1700–1721) і час ад часу гучыць інфармацыя, што дата першага згадвання Краснаполля ў пісьмовых крыніцах адносіцца да 1708 г., намякаючы на падзеі кампаніі 1708–1709 гг. гэтай вайны, якія адбываліся на ўсходзе Рэчы Паспалітай.

Згодна з агульнапрынятым паданнем, паселішча атрымала сваю назву ад жорсткіх баёў паміж шведамі і рускімі войскамі, верагодна, маючы пад увагай колер зямлі ад пралітай крыві [1, с. 57; 2, с. 237; 3, с. 47], хаця, між іншым, гісторыя не ведае пра якія-небудзь баі паміж рускімі і шведскімі войскамі на левабярэжжы Сожа. Пасля бітвы каля в. Лясная, а потым і пад Прапойскам (1708), шведскія і рускія войскі рушылі ў бок Украіны, не ўступаючы ў сур'ёзныя сутыкненні.

Час ад часу ў пытанні аб паходжанні назвы Краснаполля гучыць і другая версія, што калісьці Краснаполле падзялялася на дзве часткі. Другая частка мела назву Маластоўка – тут як быццам бы была стаўка (стаянка) рускага цара Пятра І [4, с. 8], і такім чынам, паданне зноў спрабуе нас аднесці да часоў 1708–1709 гг. Але і гэта версія не спрацоўвае, бо вёска Маластоўка з'яўляецца на старонках пісьмовых крыніц толькі ў інвентары Прапойскага староства 1765 г., а да гэтага яна невядома. У вёсцы на той час было 43 заселеныя плацы і 3 пустыя – незаселеныя [5, арк. 19 адв.–20]. Сваю назву вёска Маластоўка, магчыма, атрымала ад спалучэння слоў "малы ставок", запруда і г.д. – на рэчцы Ільініч, дзе быў млын [4, с. 8].

У паходжанні назвы паселішча Краснаполле зрэдку сустракаецца і больш праўдападобнае тлумачэнне: ад старадаўняга сэнса слова "красны" – прыгожы. Таму назву паселішча, хутчэй за ўсё, атрымала ад прыгожа апрацаваных палёў [4, с. 8].

Дык калі ж у рэальнасці магло ўзнікнуць паселішча на тэрыторыі Краснаполля, і калі яно ўпершыню трапляе на старонкі пісьмовых крыніц?

Археалагічныя даследаванні помнікаў сярэднявечча, якія праводзіліся ў бліжэйшым наваколлі сучаснага Краснаполля пачынаючы з канца XIX ст., паказалі, што рэгіён быў асвоены радзімічамі ўжо ў XI–XII стст. Недаследаваны курганны могільнік XI–XIII стст. з 24 курганаў існаваў у канцы XIX ст. на левым беразе р. Тур'я, на паўночна-усходнім ускрайку сучаснага гарадскога пасёлка, каля былога фальварка Краснаполле [6, с. 48; 7, с. 124]. Побач з гарадскім пасёлкам, у сучаснай в. Сідараўка ў XIX ст. існавала 36 курганаў, з якіх пяць было даследавана і ўстаноўлена, што пахаванні ў іх выкананы па абрадзе інгумацыі і датуюцца XI–XII стст. [6, с. 69–71; 7, с. 138; 8, с. 63].

Існаванне раней курганнага могільніка на тэрыторыі сучаснага гарадскога пасёлка і курганнага могільніка ў в. Сідараўка сведчыць пра тое, што недзе побач з імі былі і паселішчы, жыхарам якіх могільнікі належалі. Археалагічна яны пакуль не выяўлены, але іх пошукі трэба весці ўздоўж рэчак, якія былі не толькі воднымі артэрыямі, але і крыніцамі вады. Назва гэтых паселішчаў XI–XIII стст. гісторыя не захавала, але іх існаванне на тэрыторыі сучаснага Краснаполля не выклікае сумненне. Таму паселішча на месцы сучаснага Краснаполля пачало фарміравацца, як мінімум, з XI–XII стст. Але ці працягвала існаванне гэтае паселішча ў XIV–XV стст. пакуль невядома, бо археалагічна яно не выяўлена, а ў пісьмовых крыніцах не згадваецца.

У XVI–XVII стст. гэты рэгіён быў спрэчнай тэрыторыяй і зонай баявых дзеянняў паміж рускімі і літоўскімі войскамі амаль падчас кожнай са шматлікіх войнаў паміж Рускім царствам і Рэччу Паспалітай, дзе вёскі бясконца гарэлі і рэдка траплялі на старонкі пісьмовых крыніц. Таму і Краснаполле не згадваецца ў пісьмовых крыніцах XVI – першай паловы XVII ст. сярод вёсак Прапойскага староства – воласці, у склад якога ўваходзіла гэтая тэрыторыя, пачынаючы з адміністрацыйна-тэрытарыяльнай рэформы, праведзенай у Вялікім Княстве Літоўскім у 1565–1566 гг. Магчыма, тое паселішча, якое існавала тут у XI–XII стст., было знішчана падчас гэтага ліхалецця.

Сярэдзіна XVII ст. таксама была катастрафічнай для ўсходніх раёнаў ВКЛ у сувязі з вайной Рускага царства з Рэччу Паспалітай 1654–1667 гг., у выніку якой размешчанае побач Мсціслаўскае ваяводства страціла амаль 70% насельніцтва, а ў Рэчыцкім павеце, куды ўваходзіла Прапойскае староства, было знішчана

да 80% насельніцтва [9, s. 9, 19, 22], і фактычна другая палова XVII ст. была перыядам адраджэння края пасля вайны [10, с. 269–270].

Працэс адраджэння ўсходніх раёнаў Рэчы Паспалітай паскорыўся пасля заключэння ў 1686 г. "Вечнага міру" паміж Рэччу Паспалітай з Рускім царствам, пасля якога пачалося адносна мірнае асваенне памежжа як з боку Варшавы, так і з боку Масквы. Але ў інвентарах Прапойскага староства 1676, 1677 і 1682 гг. не згадваецца ні вёска, ні слабада Краснаполле, што адзначае адсутнасць аднайменнага паселішча ў гэты час. Крыніцы згадваюць тут толькі існуючыя да сённяшняга дня вёскі Сабалі, Усцінавічы, Палуж-1-я, і зніклыя ў ХХ ст. вёсак Галоўчыцы, Бакунавічы, Чудзяны (Чэрыкаўскі раён), вёскі Бірулі, Валынцы, Горна (Краснапольскі раён). А ўсяго ў Прапойскім старостве ў 1682 г. было 261 дым [11, с. 24, 29, 54; 12, с. 215, 216: 13, арк. 147адв. – 152адв., 163адв., 211–214].

Узнікненне новых вёсак і асваенне памежных рэгіёнаў асабліва паскорылася з другога дзясяцігоддзя XVIII ст., пасля завяршэння на ўсходзе Рэчы Паспалітай кампаніі 1708–1709 гг. падчас Паўночнай вайны Расіі са Швецыяй, у якой Рэч Паспалітая была саюзнікам Расіі. У русле гэтай кампаніі час ад часу і ўзнікае дата 1708 г., якую лічаць за дату першага згадвання ў пісьмовых крыніцах Краснаполля [3, с. 36–37].

Сапраўды, 5 студзеня 1732 г. расійская імператрыца Ганна Іаанаўна надала падстолію літоўскаму Антонію Міхалу Патоцкаму на памежжы Рэчы Паспалітай з Расіяй некаторыя землі, якія раней набыў расійскі князь і граф, фаварыт імператара Пятра І А.Д. Меньшыкаў. Сярод іх згадваецца і маёмасць Краснаполле [14, с. 149–150]. А дата 1708 г. усплывае ў дадзенай сітуацыі ў сувязі з ваеннай кампаніяй 1708–1709 гг. на ўсходзе Рэчы Паспалітай, пасля якой кароль Аўгуст ІІ Моцны падараваў некаторыя памежныя вёскі А.Д. Меньшыкаву ў знак падзякі за актыўны ўдзел у баявых дзеяннях.

Аднак у дадзеным выпадку ў крыніцы непасрэдна ўказана, што гэта населены пункт Мсціслаўскага ваяводства, у той час, як сучасны цэнтр Краснапольскага раёна знаходзіўся на тэрыторыі Прапойскай воласці Рэчыцкага павету Менскага ваяводства. З гэтага вынікае, што ў крыніцы гаворка ідзе абсалютна пра іншы аднайменны населены пункт, які і да сённяшняга дня існуе ў Шумяцкім раёне Смаленскай вобласці Расіі на р. Іпуць, а да першага падзелу Рэчы Паспалітай 1772 г. знаходзіўся ў складзе гэтай дзяржавы на самай мяжы з Расіяй. Таму дата 1708 г. не мае ніякага дачынення да вывучаемага аб'екта.

На сённяшні дзень цікавы нам населены пункт Краснаполле ўпершыню згадваецца толькі ў інвентары Прапойскага староства, складзенага 15 студзеня 1741 г. Вёска Краснаполле была ў складзе Засожскай воласці Прапойскага староства, у ёй на той час налічвалася 16 гаспадарак і быў млын [15, арк. 137–144]. Мяркуючы па колькасці гаспадароў, гэта быў адным з самых вялікіх населеных пунктаў войтаўства і таму не дзіўна, што яна ўжо ў той час выступала ў якасьці пэўнага цэнтра акругі: у ім знаходзілася царква, якую прапойскі стараста Мікалай Вышынскі 20 студзеня 1744 г. перавёў у падпарадкаванне грэка-каталіцкім іерархам [16, с. 381]. Улічваючы, што вёска Краснаполле ўжо выплочвала падаткі, то паселішча ўзнікла не менш за 10–15 год да яе згадкі ў крыніцы, не пазней за 1726–1730 гг., бо звычайна для новазасвоенага паселішча давалі "слабаду" – вызваленне ад выплаты падаткаў для таго, каб жыхары маглі адбудавацца, пачаць весці гаспадарку, на 10 год.

Гэтаму не пярэчаць і археалагічныя даследаванні. Археалагічная шурфоўка, праведзеная ў цэнтры сучаснага гарадскога пасёлка ў 2005 г., не выявіла тут матэрыялы раней за пачатак XVIII ст. [17, с. 8–9]. З улікам праведзенай археалагічнай шурфоўкі і выяўленага ўжо пасля іх правядзення плана Краснаполля 1784 г., найбольш перспектыўным для далейшага пошука слядоў Краснаполля XVIII ст. а, магчыма, і больш ранняга часу, трэба лічыць раён, абмежаваны сучаснымі вуліцамі Набярэжнай, Маякоўскага, Ленінскай і гарадскім скверам. На час правядзення шурфоўкі ў 2005 г. археалагічных даследаванняў у прапанаваных месцах не былі магчымымі, таму што тэрыторыя была занята засеянымі агародамі.

Магчымасць узнікнення Краснаполля ў 10–20-х гадах XVIII ст. укладваецца ў агульны і магутны працэс асваення памежжа, які распачаўся на пачатку XVIII ст. як з боку Расіі, так і Рэчы Паспалітай пасля заключэння ў 1686 г. "Вечнага міру" паміж Рускім царствам і Рэччу Паспалітай [10, с. 270–277; 18, с. 121–129].

Наступныя інвентары, якія захаваліся ў Прапойскім старостве 1750 і 1751 гг., паказваюць нам як паступовы рост колькасці насельніцтва, так і рост агульнай колькасці населеных пунктаў у старостве, што сведчыць пра асваенне краю.

Хоць і зараз Прапойск заставаўся невялікім мястэчкам, у якім на старасцінскіх пляцах пражываў толькі 101 жыхар, але зараз у старостве было ўжо 39 вёсак і 9 слабодаў. Аднак паселішчы не былі вялікімі. У сярэднім у іх налічвалася 12–15 гаспадарак [13, арк. 155–185].

Рост колькасці населеных пунктаў і насельніцтва адбываўся і ў Засожскім войтаўстве Прапойскага староства, дзе ў 1751 г. налічвалася 23 вёскі з 342-ма гаспадаркамі. Прычым, улічваючы, што ў вёсках Прапойскага староства ў гэты год налічвалася 639 гаспадарак, то Засожская воласць была адным з самых заселеных рэгіёнаў адміністрацыйна-гаспадарчай адзінкі.

Краснаполле паступова развівалася. Ужо ў інвентары Прапойскага староства ад 7 мая 1750 г. у вёсцы згадваецца 30 дымоў, млын на 1 кола, і мяркуючы па прозвішчах жыхароў, яны былі хрысціянамі [11, арк. 227адв.].

У 1751 г. у Краснаполлі налічваліся тыя самыя 30 гаспадарак што і год назад, што складала амаль 9% гаспадарак войтаўства, і дзейнічаў млын [15, арк. 180]. Паступовае ўцягванне рэгіёна ў гандлёвыя сувязі выклікала неабходнасць мець у старостве не толькі адзін гандлёва-рамесны цэнтр, якім быў Прапойск, але і шэраг іншых, якія станавіліся бы своеасаблівым мостам паміж вёскай і цэнтрам акругі. Тым болей, што Засожскае войтаўства ўяўляла сабой пэўны адміністрацыйна-гаспадарчы комплекс староства, размешчаны абасоблена за Сожам, якому ўжо быў патрэбны свой аб'яднаўчы цэнтр, бо акрамя Прапойска, астатнія бліжэйшыя рамесна-гандлёвыя цэнтры адносіліся да іншых адміністрацыйных адзінак Рэчы Паспалітай: Чэрыкаў быў у складзе Віцебскага ваяводства, Касцюковічы ў складзе Мсціслаўскага.

Верагодна, удалае размяшчэнне вёскі Краснаполле на гандлёвым шляху, занятак пэўнай колькасці насельніцтва паселішча гандлем, яго значнасць па колькасці насельніцтва ў параўнанні з іншымі вёскамі паспрыяла таму, што ў 1754 г. з каралеўскай канцыляры выходзіць прывілей аб наданні мястэчку Краснаполлю праваў на 4-х ярмарак ў год. Першая ярмарка павінна была адбыцца 20 верасня, другая – 1 снежня, трэцяя – у чацвёртую нядзелю па "рускаму Раству", чацвёртую на "зялёныя" святкі рускія [19, арк. 557–538].

З гэтага дакумента становіцца зразумелым, што недзе паміж 1751 і 1754 гг. Краснаполле атрымала прывілей на заснаванне на падставе вёскі мястэчка, які пакуль не выяўлены і, такім чынам, паступова Краснаполле пачало пераўтварацца ў невялікі адміністрацыйны і рамесна-гандлёвы цэнтр у Засожскім войтаўстве Прапойскага староства.

Пераўтварэнне вёскі ў мястэчка садзейнічала яго далейшаму развіццю. Ужо ў інвентары Прапойскага староства 1765 г. згадваецца, што ў мястэчку Краснаполле было 128 дамоў, 3 млыны і фолюш. Адбыліся значныя перамены і па канфесійнаму складу насельніцтва Краснаполля: зараз тут было 54 хрысціянскіх і 72 яўрэйскія дамы [5, арк. 20адв.–24]. І гэта не было малым мястэчкам таго часу, бо ў мястэчку Гейшын (суч. в. Гайшын Слаўгарадскага раёна), якое ўваходзіла ў склад Новабыхаўскага войтаўства Быхаўскага графства, у 1758 г. налічваўся 71 дым (58 хрысціянскіх і 13 яўрэйскіх), у якіх пражывалі 204 мужчыны і 144 жанчыны (348 чалавек). У мястэчку былі карчма, млын і адзначаецца, што яго жыхары вольны ад выканання усякіх павіннасцяў акрамя рамонту мастоў і грэбель. Апошняе, падкрэсліваецца, яны павінны выконваць іх згодна "звычаеў даўніх" [20, арк. 80–81; 21, арк. 308 адв.–311].




Мал. **План Краснаполля пасля яго ўваходу ў склад Расійскай імперыі**

Пасля першага падзелу 1772 г. Рэчы Паспалітай і ўваходу яе зямель у склад Расійскай імперыі, у 1774 г. Прапойскім староствам пражывалі разам 4265 чалавек, з якіх 3172 былі перададзены расійскаму віцэ-канцлеру Галіцыну, а астатнія – у арэнду розным асобам [22, с. 88].

Уяўленне аб Краснаполлі пасля яго ўваходу ў склад Расійскай імперыі даюць не толькі яго план, зняты падчас Генеральнага межавання, праведзенага ў 1784 г. [23] (мал.), але і статыстычная інфармацыя аб яго стане.

Згодна з планам, Краснаполле мела рэгулярную квартальную забудову, рынкавую плошчу, на якой стаяла царква. Аднак у параўнанні з інвентаром 1765 г. у Краснаполлі рэзка скарацілася колькасць насельніцтва, што пакуль не паддаецца тлумачэнню. Паводле статыстычных звестак, у 1784 г. у Краснаполлі налічвалася толькі 40 двароў у якіх пражывала 199 чалавек, а ў размешчанай побач в. Маластоўцы было 20 двароў і пражывала 157 чалавек [24, с. 111]. Што стала прычынай такога змянення колькасці двароў у параўнанні з 1765 г., незразумела.

Тым не менш Краснаполле і надалей заставалася невялікім мястэчкам у Чэрыкаўскім уездзе Магілёўскай губерні, і застаецца адміністрацыйна-гаспадарчым цэнтрам сучаснага Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласці.

**Заключэнне.** Аналіз пісьмовых крыніц паказвае, што вёска Краснаполле ўзнікла ў 10–20-я гады XVIII ст. і гэта было выклікана сацыяльна-эканамічным развіццём рэгіёна, якое актывізавалася пасля заключэння ў 1686 г. "Вечнага міру" Рэчы Паспалітай з Расіяй. Менавіта ён даў штуршок для асваення памежжа як з рускага боку, так і з боку Рэчы Паспалітай.

## Літаратура


1. Памяць: гісторыка-дакументальная хроніка Краснапольская райна. – Мінск: КП "Паліграфафармленне", 2001. – 574 с.
2. Гарады і вёскі Беларусі: Энцыклапедыя: у 8 т. / рэдкал.: Т.У. Бялова (дырэктар) [і інш.] – Мінск: Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2009. – Т. 6. Кн. 2. Магілёўская вобласць. – 592 с.
3. Лабаноўскі, Л.В. Бацькаўшчына (Гісторыя Краснапольшчыны ў пытаннях і адказах) / Л.В. Лабаноўскі. – Мазыр: Выдавецкі дом "Белы Вецер", 2004. – 360 с.
4. Леса и люди Краснопольщины. Справочно-информационный материал. – Краснополье, 2009. – 104 с.
5. Дзяржаўны гістарычны архіў Літоўскай Рэспублікі. Ф. Старажытныя акты. Адз. зах. 3803. – Інвентар Прапойскага староства 1765 г.
6. Копытин, В.Ф. Археологическая карта Краснопольского района Могилевской области / В.Ф. Копытин. – Могилев, 1996. – 124 с.
7. Копытин, В.Ф. Свод памятников археологии Чернобыльской зоны Могилевской области / науч. ред. Г.В. Штыхов / В.Ф. Копытин. – Могилев: Изд-во МГУ им. А.А. Кулешова, 1998. – 241 с.
8. Сведения 1873 года о городищах и курганах. Могилевская губерния // Известия археологической комиссии. – Спб., 1903. – Вып. 5. – С. 29–64.
9. Morzy, J. Kryzus demograficzny na Litwe i Bialarusi w 1 polowie XVII w. / J. Morzy / Uniw. Im. A. Mickiewica w Poznanju; Wydzial Filozoficzno-Historyczny. Seria Historia.– Poznań, 1965. – N 21. – 405 s.
10. Мяцельскі, А.А. Мсціслаўскае княства і ваяводства ў XII–XVIII стст. / А.А. Мяцельскі. – Мінск: Беларус. навука, 2014. – 664 с.
11. Рапановіч, Я.Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Магілёўскай вобласці / Я.Н. Рапановіч / рэд. П.П. Шуба. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 240 с.
12. Список населённых мест Могилевской губернии / под ред. Г.П. Пожарова. – Могилев: Губ. типография, 1910. – 250 с.
13. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). – Ф. 694. Воп. 4, Адз. зах. 1556. – Королевские листы подданным Чечерской волости. – 246 с.
14. Акты Виленской археографической комиссии. – М.: «Книга по требованию», 2018. – Т. 13. Акты Главного Литовского трибунала. – 493 с.
15. Archiwum Państwowe w Krakowie. Oddział I. Archiwum Młynarskiego Chodkiewiczów. Signatura 1020.
16. Бантыш-Каменский, Н.Н. Исторические известия о возникшей в Польше унии с показанием начала и важнейших, в продолжении оной через два века приключений, паче же о бывшем от Римлян и Униатов на благочестивых тамошних жителей гонений / Н.Н. Бантыш-Каменский. – М.: Синодальная типография, 1805. – 387 с.
17. Справаздача Мяцельскага А.А. пра праведзеныя ў 2005 г. археалагічныя даследаванні ў Краснапольскім раёне Магілёўскай вобласці // Архіў навуковай археалагічнай дакументацыі Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Арх. спр. № 2307.
18. Крашенинников, В.В. Брянский уезд в XVI – первой половине XIX в. (ист.-географ. обзор) / В.В. Крашенинников // Из истории Брянского края: материалы юбилейной ист.-краевед. конф., посвящ. 50-летию образования Брянской области и 50-летию Победы в Великой Отечественной войне / Администрация Брянской обл. [и др.], Брянск, 23 марта 1995 г. – Брянск: Изд-во Брянск. гос. пед. ун-та им. акад. И.Г. Петровского, 1995. – С. 121–129.
19. НГАБ. – КМФ-18, В. 1, адз. зах. 179. Арк. 557– 558.
20. Biblioteka Cartoryskich w Krakowie. Dzial rękopisów. Signatura 9113.
21. Biblioteka Cartoryskich w Krakowie. Dzial rękopisów. Signatura 9115.
22. Жукович, В. Сословный характер населения западной России в царствование Екатерины II. Дворянство восточной Белоруссии / В. Жукович // Журнал Министерства народного просвещения. – 1915. – часть 55, январь. – С. 76–109.
23. Расійскі дзяржаўны архіў старажытных актаў. – Ф. 1354. В. 245/1. Адз. зах. К-8, галка чырвоная. – план местечка Краснополье 1784 г.
24. Анішчанка, Я.К. Генеральнае межаванне ў Беларусі. Дапаўненне да кнігі "Генеральнае межаванне ў Беларусі" / Я.К. Анішчанка. – Магілёў–Горкі, 2002. – 120 с.


*Паступіў у рэдакцыю 15.12.2021*